лепшымі знаходкамі. Неўзабаве стары бор скончыўся. Хутка павінна была паказацца іх вёска. Сябры прыбавілі кроку. *(Паводле П. Рунца.)*

**неўзаба́ве** — хутка, скора

Знайдзіце ў першым сказе назоўнікі. Падкрэсліце словы, якія замяняюць гэтыя назоўнікі ў іншых сказах.

❖ Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань.

## Тыпы тэкстаў

**29.** Прачытайце тэксты. Якая тэма іх аб'ядноўвае?

### Жоўцік

Раніцай Жоўцік выйшаў з маці на прагулку. Ён з захапленнем агле́дзеў двор, пабег па дарожцы. Маці знайшла смачнае зярнятка і паклікала сваё куранятка.

Раптам у двор ускочыў вялікі кот. Жоўцік спалохаўся. Курыца адразу ж прыўзняла крыло. Жоўцік падбег да маці, прытуліўся да яе і супакоіўся. Потым ён соладка зажмурыўся і заснуў. *(Паводле П. Саковіча.)*



## Сонечным днём

Быў сонечны дзень. Па вуліцы ішла мама з маленькай дачушкай. Яны былі ў аднолькавых па расфарбоўцы сукенках: бялюткіх як першы снег, з сінімі кветачкамі валькамі. Мама трымала дачушку за руку. Дзяўчынка з цікавасцю глядзела ва ўсе бакі, уверх і ўніз. *(Паводле І. Мурaвейкі.)*



## Самы дарагі чалавек

Самы дарагі чалавек для кожнага дзіцяці — яго матуля.

Мама заўсёды прыйдзе на дапамогу і падтрымае ў цяжкую хвіліну. Яна ўсё зразумее і дасць карысную параду. Маці даруе дзіцяці любую крыўду і аддасць усё самае лепшае.

Матулю трэба берагчы! Яна так клапоціцца пра нас, што часам забываецца пра сябе. Не трэба прычыняць ёй лішніх клопатаў.

У якім тэксце:

- расказваецца пра падзеі, што адбываюцца з маці і яе дзіцем;
- апісваюцца маці і дзіця;
- даказваецца вялікая роля маці ў жыцці дзіцяці?

Зместу якога тэксту адпавядае некалькі малюнкаў? Змест якога тэксту адлюстраваны на адным малюнку? **?!** Чаму складана перадаць на малюнку змест трэцяга тэксту?

**?!** Які з тэкстаў з'яўляецца апісаннем, які — апавяданнем, а які — разважаннем?



Правообладатель Акадэмія адукацыі

Тэксты падзяляюцца на апавяданні, апісанні і разважанні.

**30.** Разгледзьце схему. Назавіце асаблівасці тэксту-апавядання, тэксту-апісання і тэксту-разважання.

**Тыпы тэкстаў**

| **Апавяданне** | **Апісанне** | **Разважанне** |
|---|---|---|
| Расказваецца пра дзеянні і падзеі, што ідуць адно за адным | Апісваюцца прадметы, людзі, жывёлы, малюнкі прыроды | Тлумачыцца, даказваецца штосьці; гаворыцца пра прычыны падзей і з'яў |
| *Што адбылося?* | *Які прадмет?* | *Чаму?* |

На якое пытанне дае адказ тэкст-апавяданне? Тэкст-апісанне? Тэкст-разважанне?

Запішыце тэкст-апісанне з практыкавання 29. Падкрэсліце словы, якія дапамагаюць звязаць сказы ў тэксце.

**31.** Прачытайце прыказкі. Пра якія адносіны паміж матуляй і дзецьмі гаворыцца ў іх?

1. Ніхто так *(д/дз)*ецям не спагадае, як ма*(т/ц)*і родная. 2. Якая мая мама, такая я і сама.

**спагада́е** — спачувае, шкадуе

Да зместу якіх тэкстаў з практыкавання 29 падыходзіць першая прыказка? Спішыце яе, раскрываючы дужкі.

З якім тэкстам суадносіцца другая прыказка?

**Рм** Калі і як беларусы адзначаюць Тыдзень бацькоўскай любові?

**32.** Вызначце тып тэксту па прапанаваных загалоўках.

Як мы з мамай хадзілі ў тэатр.
Маміна калекцыя лялек.
Мая матуля — рукадзельніца.

**рукадзе́льніца** — жанчына, якая займаецца шыццём, вязаннем, вышыўкай

Апішыце словамі малюнкі, якія можна намаляваць да тэксту-апавядання. Што б вы адлюстравалі на малюнку да тэксту-апісання?

**Рм** Раскажыце, чым любяць займацца вашы сваякі. Якія ў іх ёсць калекцыі?

**33.** Прачытайце сказы. Расстаўце іх у патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.

Пад страхой хаты вераб'іха гадавала чатырох дзетак. Хутка яны сталі падобнымі на сваю маму. Мама карміла іх чарвякамі і вусенямі. Цэлы дзень яна насіла ім ежу. Малыя смешна разяўлялі свае роцікі. Птушаняты раслі не па днях, а па гадзінах. *(Паводле І. Муравейкі.)*

Запішыце выпраўлены тэкст. Вызначце яго тып.

Падкрэсліце словы, якія дапамагаюць звязаць сказы ў тэксце.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

## Тэкст-апавяданне

**34.** Прачытайце тэкст. Як Віця дапамог маме? За што людзі былі яму ўдзячны?

### Маленькі паштальён

Раніцай маці выправіла Віцю ў школу, потым пайшла на пошту. Там яна расклала газеты, пісьмы, часопісы на дзве кучкі. Адна кучка — для падпісчыкаў, што жывуць з левага боку вуліцы, другая — што з правага.

Пасля заняткаў Віця хуценька апрануўся і пабег на пошту. Там ён узяў сваю порцыю пошты і разам з маці выйшаў на двор. Яны пайшлі па вуліцы і пачалі разносіць у хаты свежыя газеты, пісьмы.

Вяскоўцы шчыра дзякавалі маленькаму паштальёну за радасныя весткі. Мама была задаволена сваім памочнікам. *(Паводле П. Рунца.)*

Колькі малюнкаў вы намалявалі б да тэксту? Апішыце іх словамі. Вызначце тып тэксту.

Падзяліце тэкст на часткі. Складзіце і запішыце яго план.

Схема пабудовы тэксту-апавядання:
- пачатак падзей, дзеяння;
- развіццё падзей, дзеяння;
- заканчэнне падзей, дзеяння.

**паштальён**

**35.** Прачытайце частку тэксту з папярэдняга практыкавання, якая з'яўляецца пачаткам дзеяння. Назавіце словы, што служаць для сувязі сказаў у тэксце.

Запішыце заключную частку тэксту. Знайдзіце і падкрэсліце форму слоўнікавага слова.

Выпішыце з тэксту дзеясловы ў форме прошлага часу.

**Рм** Вусна перакажыце тэкст з апорай на запісаныя дзеясловы.

**У тэксце-апавяданні выкарыстоўваецца шмат дзеясловаў.**

**36.** Прачытайце тэкст. Чаму ражок стаў міжнародным сімвалам пошты?




Сёння тата ўзяў мяне на пошту. Яму трэба было адправіць ліст. Я нёс ліст у руках. Мне хацелася самому ўкінуць яго ў паштовую скрынку.

На пошце тата набыў патрэбныя маркі, наклеіў іх на канверт. Калі я ўкідваў ліст у паштовую скрынку, то заўважыў на ёй малюнак. Тата патлумачыў, што на скрынцы адлюстравана эмблема пошты.

Ён расказаў, што ў старажытнасці ганцы з поштай трубілі ў рог. Людзі чулі гэты сігнал і прыходзілі па свае лісты. Так рог стаў міжнародным сімвалам пошты. *(Паводле В. Прохаравай.)*

Вызначце тып тэксту. Складзіце і запішыце яго план.

Запішыце частку тэксту, якая перадае пачатак дзеяння. Падкрэсліце словы, што служаць для сувязі сказаў у ёй.

❖ Якія сучасныя сродкі сувязі вы ведаеце? Як можна павіншаваць сваякоў і знаёмых з рознымі святамі? Як можна даслаць ім патрэбную інфармацыю?



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**Рм** **37.** Прачытайце пачатак і канцоўку апавядання.

## Падарунак для бабулі

Бабуля Даніка і Алінкі жыве далёка ад іх. Унукі прыязджаюць да яе на канікулы.

Хутка бабуля будзе святкаваць дзень нараджэння. Тата і мама ўжо купілі падарункі. У дзень нараджэння бацькі і дзеці патэлефануюць ёй, але паедуць у госці толькі праз месяц.

Унук і ўнучка вырашылі падрыхтаваць для бабулі яшчэ адзін сюрпрыз.








Якраз у дзень нараджэння бабуля атрымае віншавальную паштоўку. Яна будзе вельмі рада.

Разгледзьце малюнкі. Прыдумайце па іх тую частку апавядання, якой не хапае. Выкарыстайце наступныя спалучэнні слоў.

Сваімі рукамі, віншавальную паштоўку, напісала на канверце, адрас бабулі, паклалі паштоўку, пайшлі на пошту, укінулі ў паштовую скрынку.

Раскажыце апавяданне, якое ў вас атрымалася.

**38.** Прачытайце. Вызначце тып тэксту. Назавіце словы, якія дапамагаюць звязаць сказы ў тэксце.

### Як ідуць лісты

Мы прывыклі даставаць з паштовай скрынкі лісты. Ці задумваліся вы, як яны даходзяць да нас?

Спачатку чалавек апускае ліст у п..штовую скрынку. Потым прыходзіць паштал..ён і забірае канверты. Ён прыносіць лісты ў аддзяленне сувязі. Гашэнне марак і штэмпеляванне выконвае маш..на. Затым лісты ра..кладваюць па адрасах адпраўлення. Пошта дастаўляецца па чыгунцы і самалётам з горада ў горад. Яна трапляе ў аддз..ленні сувязі і перадаецца паштал..ёнам на адрас.

Вось які складаны шлях праходзяць лісты. *(Па матэрыялах часопіса «Вясёлка».)*

**гашэ́нне ма́ркі** — нанясенне на яе паштовага штэмпеля

Выпішыце сказы, у якіх ёсць словы з прапушчанымі літарамі. Устаўце ў словы патрэбныя літары.

## Тэкст-апісанне

**39.** Прачытайце тэкст. Як выглядае Сцёпка? Які ў яго характар? Чым хлопчык любіць займацца?

У мяне ёсць сябры́ ...



Правообладатель Акадэмія адукацыі

Надта ж вялікі дамасед гэты Сцёпка. Ён заўсёды адмаўляецца ад рыбалкі. Яго не ўбачыш на двары з футбольным мячом. Сцёпка цэлымі днямі праседжвае над кнігамі. Ён ведае шмат цікавых гісторый.

Я рады, што сябрую з ім. *(Паводле В. Хомчанкі.)*

Які малюнак вы намалявалі б да тэксту? Апішыце яго словамі. Вызначце тып тэксту. Дайце яму назву.

На колькі частак можна падзяліць тэкст? Пра што ідзе размова ў кожнай частцы?

Прачытайце план. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? Як яе трэба змяніць?

План

1. Як выглядае хлопчык, чым ён любіць займацца?
2. Хто такі Сцёпка?
3. Як аўтар ставіцца да яго?

Запішыце выпраўлены план.

**Схема пабудовы тэксту-апісання:**
- **называецца прадмет апісання;**
- **пералічваюцца яго характэрныя прыметы;**
- **даецца ацэнка прадмету, выказваюцца адносіны да яго.**

**40.** З тэксту практыкавання 39 выпішыце прыметнікі, якія дапамагаюць апісаць Сцёпку.

Сцёпка (я к і?) худзенькі, ...; з вяснушкамі (я к і м і?) ...; дамасед (я к і?) ... .

**Рм** Вусна апішыце свайго сябра або сяброўку. Карыстайцеся словамі ў дужках.

У мяне ёсць *(сябар/сяброўка)* … . Гэта *(прыгожы(ая)/сімпатычны(ая)) (дзяўчынка/хлопчык) (высокага/нізкага/сярэдняга)* росту з *(доўгімі/кароткімі)* валасамі *(светлага/цёмнага)* колеру. У *(яго/яе)* вачах заўсёды свеціцца *(дабрыня/усмешка)*.

… любіць *(маляваць, чытаць кнігі, гуляць у футбол/хакей/камп'ютарныя гульні)*. *(Ён/яна)* займаецца … . … *(навучыла мяне/навучыў мяне)* … .

Я вельмі *(рады/рада)*, што маю *(такога сябра/такую сяброўку)*.

**У тэксце-апісанні выкарыстоўваецца шмат прыметнікаў.**

**41.** Прачытайце тэкст. Як выглядае любімы кубачак Міхася?

У Міхася ёсць любімы фарфоравы кубачак. Толькі з яго хлопчык п'е малако, кампот, кісель, чай…

На кубку намалявана шмат рознакаляровых кветак. Ён нагадвае жывы букет. З донца глядзіць смешная каці́ная мордачка. Яна нібы гаворыць: «Гэта я дапамагаю Міхасю піць малако».

Хлопчык сам мые любімы кубачак. Ён хоча, каб каціная мордачка заўсёды блішчэла чысцінёй. *(Паводле І. Муравейкі.)*

Вызначце тып тэксту. Падбярыце да яго загаловак. Складзіце і запішыце яго план.

Спішыце другую частку тэксту. Знайдзіце і падкрэсліце ў ёй прыметнікі.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**Рм** Апішыце свой любімы кубачак. Выкарыстайце наступныя словы і спалучэнні слоў.

Шкляны, фарфоравы, белы, каляровы, у гарошак, у палоску, з малюнкам, з надпісам, самы вялікі, маленькі, невялікі, меншы за іншыя.

**ме́ншы**

**42.** Прачытайце тэкст. Чым упрыгожаны асенні лес? Чаму рознакаляровае лісце ляжыць не на сваім месцы?

Асенняе лісце… Колькі яго на палянцы! Якіх толькі колераў не сустрэнеш!

Ноччу пагаспадарыў свавольнік вецер, усё пераблытаў у лесе. Пад дубам яркімі вугольчыкамі гараць барвовыя лісты асіны. Пад чырвонай асінай цямнеюць дубовыя лісточкі. Пад залацістым клёнам ляжыць бурае лісце рабіны. У цэнтры палянкі раскінуўся дыван з жоўтага лісця бяроз.

Ад гэтай прыгажосці цяжка вочы адвесці. *(Паводле Р. Ігнаценкі.)*



Вызначце тып тэксту. Падбярыце да яго загаловак.

На колькі частак можна падзяліць тэкст? Прачытайце план.

План

1. Жарты свавольніка ветру.
2. Рознакаляровы дыван з лісця.
3. Чароўная прыгажосць.

Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? Як яе трэба змяніць? Запішыце выпраўлены план.

Знайдзіце ў тэксце прыметнікі. З якімі назоўнікамі яны звязаны па сэнсе?

**Рм** Вусна перакажыце тэкст па плане.

**43.** Прачытайце. Вызначце тып тэксту.

## Восень

Спадцішка падкралася восень. З кожным днём усё гусцей кладуцца яе фарбы-вясёлкі.

Ш..лясціць з..лацістым лісцем б..роз вецер. Трапечуцца чырвоныя макаўкі асін. Зацвілі ліловыя верасы. Зардзеліся чырвоныя гронкі рабін. Пунсаве́юць, гнуцца долу г..лінкі спелых калін. Ападаюць на з..млю рознакал..ровыя пялёсткі асенніх кветак. У празрыстым паветры плывуць с..рабрыстыя павуцінкі.

Прыгажосць прыроды проста зачароўвае. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

**спадцішка́** — ціха, непрыкметна

Спішыце частку тэксту, у якой апісваецца асенняя прырода. Устаўце прапушчаныя літары. Падкрэсліце прыметнікі.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

## Тэкст-разважанне

**44.** Прачытайце тэкст. Чаму дзень нараджэння з'яўляецца сямейным святам?

### Дзень нараджэння

Вельмі прыемна, калі помняць твой дзень нараджэння, віншуюць цябе. А ці помніш ты дні нараджэння сваякоў?

Колькі чалавек у сям'і — столькі і дзён нараджэння. У гэты дзень кожнаму дарага тваё віншаванне. Прыемна будзе, калі ты падрыхтуеш падарунак. Гэта можа быць малюнак або рэч, зробленая сваімі рукамі. Непрыгожа прасіць у бацькоў грошай, каб купіць ім падарункі.

Дзень нараджэння — сямейнае свята. Не трэба абвяшчаць усім, калі ў цябе дзень нараджэння. Блізкія людзі самі помняць, калі ты нарадзіўся. *(Паводле В. Віткі.)*

На колькі частак можна падзяліць тэкст? Пра што нагадвае нам аўтар у першай частцы? Прачытайце, як ён раіць віншаваць сваякоў. Які вывад робіцца ў апошняй частцы тэксту?

Вызначце тып тэксту.

Схема пабудовы тэксту-разважання:
- думка, якая даказваецца;
- доказ думкі;
- вывад, да якога прыходзіць аўтар.

**45.** Прачытайце. Вызначце тып тэксту.

## Сяброўства

Не таму мы сябруем, што сышліся характарамі. Характары могуць быць розныя. Сапраўднае сяброўства пачынаецца з таго, што ты заўважаеш, які добры твой сябар. Ты сам ад гэтага сяброўства становішся лепшым. У сяброўстве адзін аднаму памагаюць. Сябра не пакідаюць у бядзе. Гэта самыя вялікія пачуцці — вернасць і адданасць сяброўству. *(Паводле В. Віткі.)*

Якая думка даказваецца ў тэксце? Знайдзіце і прачытайце, як паводзяць сябе сябры. Які вывад робіць аўтар?

Падзяліце тэкст на часткі. Спішыце. Кожную частку запішыце з новага радка.

Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань. У формах аднаго і таго ж слова выдзеліце канчаткі.

**46.** Прачытайце. Якая думка даказваецца ў вершы? Зачытайце, які доказ прыводзіць унук.

## Дружбакі

Мы не проста сваякі,
мы з дзядулем — **дружбакі**.
Вось вам прымаўка мая
і расклад на цэлы дзень:
куды дзед — туды і я,
куды я — туды і дзед.

*І. Муравейка.*



Знайдзіце словы, у якіх трэба правяраць правапіс парных звонкіх і глухіх зычных. Вусна падбярыце праверачныя словы.

Падбярыце і запішыце сінонімы да выдзеленага слова.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**47.** Прачытайце. Назавіце сярод запісаных сказаў пабуджальны. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

1. Як ты да люд**з**ей, так і людзі да **ц**ябе. 2. Мы з табою, як ры**б**ка з вадою. 3. Лю́бі**ц**ь увесь све**т** лагодны прыве**т**. 4. Павер мне, як сам**о**му сабе.

Запішыце па памяці адзін сказ на выбар.

**Рм** Вызначце, да зместу якога з прачытаных на ўроку тэкстаў падыходзіць запісаны сказ. Дакажыце сваю думку.

**Рм** **48.** Прачытайце. З тэксту якога тыпу ўзяты пачатак і канцоўка?

### Чаму трэба берагчы кнігу

Кніга — гэта крыніца ведаў і надзейны сябар чалавека.

…

Чым больш кніга жыве, тым больш яе любяць і шануюць.

Вусна складзіце тую частку тэксту, якой не хапае. Выкарыстайце прапанаваныя спалучэнні слоў.

Перадаюць мудрасць народа, расказваюць пра незвычайныя мясціны на зямлі, цікавыя здарэнні, смешныя гісторыі, адказы на пытанні, сябры чалавека, доўгае жыццё, перадавацца дзецям і ўнукам.

**49.** Прачытайце. Вызначце тып тэксту.

Для чаго нам патрэбны скорагаворкі? Скорагаворкі дапамагаю..ь нам вучыцца радасна, вес..ла, у ахвотку. Гало..нае ў скорагаворцы не ў тым, каб

скора сказа..ь. Важна правільна, выразна і пр..гожа вымаві..ь кожнае слова. Скорагаворкі вучаць гавары..ь, развіваю..ь наша маўленне. *(Паводле В. Віткі.)*

Спішыце, устаўляючы ў словы прапушчаныя літары.

**50.** Прачытайце тэксты. Якой тэмай яны аб'яднаны? Вызначце тып тэкстаў.

1. На ўскрайку лесу расла маладая елачка. Яна была згра́бная і прыгожая. Пасля дажджу з яе тонкіх іголак завушніцамі звісалі кропелькі вады. Марозным днём яловыя лапкі пакрываліся серабрыстай шэранню. У завею елачка накідвала на сябе пушыстае белае футра.

2. Елка — вечназялёнае высокае дрэва сямейства сасновых. Яе лісце — кароткая, цвёрдая і вострая іглiца. Канцы некаторых галін у елкі заканчваюцца доўгімі і завостранымі шышкамі.

3. **Ялінка**

На мяккім імху,
дзе гараць журавінкі,
нібыта квактуха,
прысела ялінка.
Зялёныя крылы
ў бакі распусціла.
Здаецца, вось-вось
прыбягуць яляняткі
і будуць дзяўбці
каля купін зярняткі.

*Г. Кляўко.*





Правообладатель Акадэмія адукацыі

**шэ́рань** — іней
**згра́бная** — стройная

У якім тэксце елка апісваецца дакладна, а ў якіх тэкстах — вобразна? Які тэкст можна сустрэць у энцыклапедыі, а якія — у мастацкай кнізе?

Знайдзіце ў першым і другім тэкстах прыметнікі, якія дапамагаюць апісаць елку.

На каго падобна елачка ў вершы? Назавіце словы і выразы, якія падказалі вам гэта. Запішыце тыя радкі верша, у якіх апісваецца елачка.

**51.** Прачытайце тэкст. На што падобны кураняты? Якія словы падказалі вам гэта?

*(Па)*двары хадзіла шэрая **чубатка**. Сама худая, шыя тоненькая. Каля яе **мітусілася** дзесяць маленькіх жо*(у/ў)*ценькіх **пухнаценькіх клубочка*(у/ў)***. Дзесяць куранятак. Куды шэрая чубатка ступіць — туды жо*(у/ў)*тыя клубочкі **коцяцца**. І **вадою**, здавалася, іх ***(не)*разальеш**. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

Словы для даведкі: *птушка, курыца; бегалі, круціліся; пушыстыя, мяккія; кураняты, птушаняты; ідуць, бягуць; вельмі дружныя, заўсёды разам.*

Растлумачце значэнне выдзеленых слоў і выразаў. Карыстайцеся словамі для даведкі. Чаму аўтар выкарыстаў у тэксце менавіта гэтыя словы і выразы?

Спішыце, раскрываючы дужкі. Падкрэсліце словы, ужытыя ў пераносным значэнні.

**52.** Вусна дапоўніце сказы ў тэксце патрэбнымі словамі і выразамі. Назавіце словы, ужытыя ў пераносным значэнні.

## Смелы Васька

Стаяў цёплы *(дзень, дзянёк)*. На зялёнай лугавіне каля доміка пасвіліся куры. Кот Васька *(бегаў, круціўся)* побач.

Бабка Ганна працавала на агародзе. Дзед пайшоў на рыбалку.

Раптам *(прыляцеў, каменем зваліўся)* на лугавіну вялікі каршун. Ён схапіў чубатку і *(рвануўся, паляцеў)* угору. У Ваські *(загарэліся, заблішчалі)* вочы. *(Выскачылі, паказаліся)* з мяккіх лап вострыя кіпцюры. Каршун пакінуў курыцу, схапіўся з катом.

Хутка да месца бойкі прыбегла бабка. Каршун ужо ляжаў на траве. Бабуля пахваліла свайго рыжага ката. *(Паводле А. Якімовіча.)*

Вызначце тып тэксту. Падзяліце яго на часткі, складзіце і запішыце план.

**53.** Прачытайце. На якое пытанне дае адказ аўтар верша? Які гэта адказ: сур'ёзны ці жартоўны?

## Чаму рака мялее летам

Чаму рака мялее летам,
бадай, усім вядома гэта.

Бо млее ўсё ад духаты
і рыбы п'юць **зашмат** вады.

*І. Муравейка.*



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**млець** — знемагаць, нясілецць ад гарачыні, спёкі
**бада́й** — *тут:* відаць, магчыма

Падбярыце сінонімы да выдзеленага слова.

❖ Патлумачце, чаму на самай справе рэкі летам мялеюць. Пры неабходнасці знайдзіце патрэбныя звесткі ў дзіцячай энцыклапедыі або ў інтэрнэце.

**54.** Прачытайце. З чым параўноўваюцца ў вершы павуціна і расінкі?



**Павуцінка**

Хусцінка з паву..інак
вісі..ь паміж галінак.
На кожнай паву..інцы
па кропельцы-расінцы.
Гара..ь расінкі-шарыкі
на сонцы, як ліхтарыкі.

*Н. Галіноўская.*

Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары. Падкрэсліце словы, ужытыя ў пераносным значэнні.

**55.** Адгадайце загадку. Назавіце ў ёй прыметнікі.



Спрытны вогненны звярок
напалохаў зноў сарок.
Прамільгнула яркай зоркай
над галінамі ... .

*У. Мазго.*

З чым параўноўваецца вавёрка ў загадцы?

**56.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна яе вымаўляць.

Вавёрка збірала а**р**эхі, сабрала а**р**эх**аў** паўмеха. *(М. Пазнякоў.)*

Растлумачце правапіс выдзеленых літар. Запішыце скорагаворку пад дыктоўку настаўніка.

Падкрэсліце дзеясловы. Вызначце іх час, лік і род.

**57.** Прачытайце тэкст. Каго сустрэлі ў лесе дзед і Сяргейка? Як яны дапамаглі вавёрцы?

## Вавёрачка

Дзед у Сяргейкі працуе леснікам. Ён часта **бярэ** хлопчыка **ў** свой **абход.**

Аднойчы пад вечар дзед і Сяргейка вярталіся дамоў. Раптам на сцяжынцы яны ўбачылі вавёрачку.

Вавёрачка таксама ўбачыла людзей і **шмыганула** ў траву. Скокнула да кустоў раз, другі, але толькі на трох лапках. Пярэдняй яна да зямлі не дакраналася.

Сяргейка з дзедам прынеслі вавёрачку дамоў, змазалі ёдам ранку, забінтавалі лапку. Хлопчык карміў яе семкамі, арэхамі.

Праз месяц ранка зажыла. Вавёрачка стала жвавая, **вёрткая.**

Хоць і не хацелася Сяргейку, але прыйшлося вавёрачку ў лес выпусціць. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

**жва́вая** — шустрая, спрытная



Правообладатель Акадэмія адукацыі

Растлумачце значэнне выдзеленых слоў і выразаў.

Коратка сфармулюйце, пра якія падзеі ідзе размова ў тэксце. Падрабязна раскажыце, як адбылася сустрэча з вавёрачкай у лесе.

Вызначце тып тэксту. Падзяліце яго на часткі.

Прачытайце план. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? Як яе трэба змяніць?

План

1. Сустрэча з вавёрачкай.
2. Хуткае выздараўленне.
3. Дзед з унукам выходжваюць вавёрку.
4. Незвычайныя паводзіны звярка.

Запішыце выпраўлены план.

**Рм** Вусна сцісла перакажыце тэкст па плане.

**58.** Прачытайце сказы. Расстаўце іх у патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст. Дайце назву тэксту.

Зубры пасвіліся на паляне. Яна паводзіла сябе насц*(е/я)*рожана, бо побач ха*(д/дз)*іла яе дзіцяня́. Зубрыха трывожна аглядалася, *(у/ў)*цягвала ноздрамі паветра. Яго трэба было ахо*(у/ў)*ваць ад усялякіх н*(е/я)*прыемнасцей. Зубраня было маленькае і бе*(з/с)*дапаможнае. *(Паводле В. Семакова.)*

Запішыце выпраўлены тэкст, раскрываючы дужкі. Вызначце яго тып.

❖ Назавіце словы, якія характарызуюць паводзіны зубрыхі. Падкрэсліце словы, якімі апісваецца зубраня.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

### *Адкажыце на пытанні*

1. З дапамогай чаго звязваюцца сказы ў тэксце?
2. Якія тыпы тэкстаў вы ведаеце?
3. Чым адрозніваюцца тэкст-апавяданне, тэкст-апісанне і тэкст-разважанне?
4. Як скласці тэкст-апавяданне?
5. Як скласці тэкст-апісанне?
6. Як скласці тэкст-разважанне?

### *Творчая хвілінка*

Уявіце, што вам неабходна скласці тэксты розных тыпаў пра нашу краіну. Прачытайце прапанаваныя загалоўкі.

Ганаруся Беларуссю.
Зямля з блакітнымі вачамі.
Цікавая вандроўка па родным краі.

Да якога тыпу тэксту падыходзіць кожны з гэтых загалоўкаў?

Складзіце адзін тэкст на выбар.

Паспрабуйце скласці некалькі тэкстаў розных тыпаў.



Правообладатель Акадэмія адукацыі